Міжнародная
платформа
па прыцягненні вінаватых да адказнасці

для

Беларусі

# Чацвёртая справаздача аб ходзе работы дзяржавам, якія аказваюць падтрымку

Кастрычнік 2022 – Сакавік 2023



Публічная

ПРА МІЖНАРОДНУЮ ПЛАТФОРМУ ПА ПРЫЦЯГНЕННІ ВІНАВАТЫХ ДА АДКАЗНАСЦІ 3

КАРОТКІ ЗМЕСТ 4

A. Сітуацыя ў краіне 6
B. Выкананне асноўных мэтаў Платформы 7
a. Збор інфармацыі і доказаў 7
i. Збор інфармацыі ў пацярпелых і іншых сведак 7
ii. Збор інфармацыі з адкрытых крыніц 7
b. Кансалідацыя,захаванне, праверка і аналіз інфармацыі і доказаў 8
i. Матэрыял пацярпелых/сведак з закрытых крыніц 8
ii. Матэрыялы з адкрытых крыніц 8
c. Дапамога органам па забеспячэнні адказнасці 9
i. Экспертыза УВКПЧ па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі 9
ii. Спецыяльны дакладчык па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі 10
iii. Органы крымінальнага правасуддзя 10
C. Абмен ведамі і нарошчванне патэнцыялу 11
a. Сакратарыят, каманды арганізацыі-кіраўніка і сукіраўнікоў 11
b. Кансультатыўны савет 12
c. Іншыя беларускія і міжнародныя арганізацыі 12
D. Падтрымка доступу да паслугаў псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымкі 12
E. Сувязі з грамадскасцю і адвакатаванне 13
F. Інфраструктура Платформы 13
a. Фінансаванне 13
b. Персанал 14
c. ІКансультацыі з экспертамі 14

Зноскі 15

## ПРА МІЖНАРОДНУЮ ПЛАТФОРМУ ПА ПРЫЦЯГНЕННІ ВІНАВАТЫХ ДА АДКАЗНАСЦІ

Платформа – гэта кааліцыя незалежных няўрадавых арганізацый, якія аб’ядналі намаганні для збору, кансалідацыі, праверкі і захавання доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, якія з’яўляюцца злачынствамі па міжнародным праве, меркавана здзейсненых беларускімі ўладамі і іншымі асобамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх. З гэтай мэтай, Платформа абапіраецца на бягучую працу беларускіх праваабарончых арганізацый па зборы інфармацыі аб парушэннях правоў чалавека, здзейсненых у Беларусі. Інфармацыя і доказы, сабраныя Платформай, будуць садзейнічаць незалежным і справядлівым крымінальным расследаванням і пераследу, што праводзяцца ў адпаведнасці з міжнародным правам і стандартамі, у нацыянальных або міжнародных судах або трыбуналах, якія маюць або могуць мець юрысдыкцыю ў дачыненні да гэтых злачынстваў. Інфармацыя і доказы таксама паслужаць падтрымкай іншым механізмам, накіраваным на забеспячэнне адказнасці за злачынствы паміжнародным праве, меркавана здзейсненым у Беларусі, у тым ліку Экспертызе УВКПЧ па разглядзе сітуацыі ў Беларусі.

Платформа складаецца з Кіруючага камітэта, які адказвае за кіраўніцтва працай Платформы, Сакратарыята і Кансультатыўнага савета. У склад Кіруючага камітэта ўваходзяць DIGNITY – Дацкі інстытут супраць катаванняў (старшыня Платформы), Праваабарончы цэнтр «Вясна» (сустаршыня), Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі (сустаршыня) і REDRESS (сустаршыня). Акрамя шэрагу беларускіх арганізацый, якія не пажадалі быць публічна названымі па меркаваннях бяспекі, у склад Кансультатыўнага савета ўваходзяць наступныя арганізацыі: Еўрапейскі цэнтр па канстытуцыйных правах і правах чалавека (ECCHR); Міжнародная федэрацыя па правах чалавека (FIDH); Міжнародны савет па рэабілітацыі ахвяр катаванняў (IRCT); Нарвежскі Хельсінкскі Камітэт; Лекары за правы чалавека (PHR); Рэпарцёры без межаў (RSF); і Сусветная Арганізацыя супраць катаванняў (OMCT). Праца Платформы вядзецца Сакратарыятам, што складаецца з юрыстаў і медыкаў, абазнаных і дасведчаных у галіне міжнародных крымінальных расследаванняў і судаводства.

Платформа была створана 24 сакавіка 2021 г. у адказ на справаздачу дакладчыка Маскоўскага механізму АБСЕ Пастаяннаму Савету АБСЕ 5 лістапада 2020 г. Сярод іншага, справаздача заклікае дзяржавы прыцягнуць да адказнасці асоб, вінаватых у катаваннях і бесчалавечным абыходжанні, у тым ліку сэксуальным гвалце, і іншых грубых парушэннях правоў чалавека, здзейсненых у сувязі з прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі 9 жніўня 2020 года.

Платформа карыстаецца падтрымкай шырокага кола дзяржаў, у прыватнасці Аўстрыі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Ірландыі, Ісландыі, Канады, Латвіі, Літвы, Ліхтэнштэйна, Нарвегіі, Нідэрландаў, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Фінляндыі, Чэхіі, Швейцары, Швецыі, Эстоніі, а таксама Еўрапейскага Саюза.

## КАРОТКІ ЗМЕСТ

### Сітуацыя ў краіне

Беларускія ўлады працягваюць пераслед праваабаронцаў, журналістаў, адвакатаў, прафсаюзных лідэраў, палітыкаў і іншых грамадзян. Па наяўных дадзеных, на 31 сакавіка 2023 г. колькасць палітычных зняволеных павялічылася да 1474 чалавек; па палітычна матываваных крымінальных справах было асуджана звыш 3 000 чалавек.[1] Толькі ў сакавіку было зроблена больш за 614 затрыманняў, пры гэтым было прызначана як мінімум 166 адміністрацыйных арыштаў і 36 штрафаў.[2] Трэцяга сакавіка 2023 г. лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру, старшыня ПЦ «Вясна» Алесь Бяляцкі, член Рады «Вясны», віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Валянцін Стэфановіч, юрыст і каардынатар кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Уладзімір Лабковіч і член Савета «Вясны» Зміцер Салаўёў (асуджаны завочна) атрымалі прысуды да пазбаўлення волі на тэрмін ад 7 да 10 гадоў.[3] Шостага сакавіка 2023 г. Святлана Ціханоўская і Павел Латушка былі асуджаны да 15 і 18 гадоў пазбаўлення волі адпаведна.[4]

Не менш за 823 некамерцыйныя арганізацыі знаходзяцца ў працэсе прымусовай ліквідацыі, яшчэ 456 арганізацый былі вымушаны самаліквідавацца.[5] З лета 2020 г. больш за 90 адвакатаў былі пазбаўлены права займацца адвакацкай дзейнасцю, а 7 адвакатаў -- пазбаўлены волі па палітычных прычынах.[6] Працягваецца сітуацыя беспакаранасці за парушэнні правоў чалавека, здзейсненыя ў Беларусі, у сувязі з выхадам Беларусі з Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які ўвайшоў у сілу з 8 лютага 2023 г.

### Збор інфармацыі і доказаў

З 1 красавіка 2021 г. “Вясна” і Міжнародны камітэт сабралі інфармацыю і сведчанні ў 1030 пацярпелых і іншых сведкаў (684 мужчын і 346 жанчын) аб меркаваных злачынствах па міжнародным праве, у тым ліку адпаведныя дакументальныя сведчанні, такія як медыцынскія і судовыя матэрыялы. З красавіка 2021 г., Платформа сабрала больш за 772 768 матэрыялаў, у тым ліку 102 740 відэа, 318 589 выявы і 351 439 тэкставых матэрыялаў з 418 адкрытых крыніц.

### Кансалідацыя. захаванне і аналіз інфармацыі і доказаў

На 31 сакавіка 2023 г. было рэструктуравана і загружана ў лічбавыя архівы Платформы каля 20 000 дакументаў, якія датычацца 2270 пацярпелых і сведак, у тым ліку стэнаграмы паказанняў сведак, медыцынскія заключэнні і судовыя матэрыялы, а таксама адпаведныя пераклады на ангельскую мову. У адпаведнасці са стратэгіяй Платформы па працы з матэрыяламі пацярпелых/сведкаў, было разгледжана і прамаркіравана ў адпаведнасці са спецыяльна распрацаванай схемай кадавання каля 60% файлаў. Акрамя таго, Платформа захавала сваю калекцыю матэрыялаў з адкрытых крыніц і прамаркіравала 3104 файлы з адкрытых крыніц у асобных наборах дадзеных, арганізаваных па тэмах, датычных дзяржаўнай палітыкі, структуры камандавання і першасных злачынстваў.

### Падтрымка Экспертызы УВКПЧ па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі

У перыяд са жніўня па лістапад 2022 г. беларускія арганізацыі-кіраўнікі Платформы садзейнічалі доступу Экспертызы УВКПЧ да 159 патэнцыйных сведак і аказалі лагістычную падтрымку ў правядзенні інтэрв›ю з адабранымі асобамі. У сувязі з запытам Экспертызы ў кастрычніку 2022 г. аб доступе да інфармацыі і доказаў па трох прыярытэтных напрамках, Платформа прадставіла падрабязны спіс з больш чым 1300 матэрыялаў з адкрытых і закрытых крыніц з адпаведнай метадалогіяй, а таксама стварыла спецыяльную прастору ў сваіх лічбавых архівах для доступу следчых Экспертызы да матэрыялаў з закрытых крыніц. Таксама Платформа ўдзельнічала ў кансультацыі спецыялістаў Экспертызы па патрэбах у сферы забеспячэння адказнасці, падчас якой Платформа заклікала Экспертызу выпрацаваць

рэкамендацыі для дзяржаў па перадачы сітуацыі ў Беларусі ў Міжнародны крымінальны суд, выкарыстанні рамак універсальнай юрысдыкцыі і трансгранічнага супрацоўніцтва, а таксама ўплыву санкцый (у прыватнасці, забароны на паездкі) на магчымасць дзяржаў атрымаць доступ да злачынцаў.

У сваім дакладзе Савету ААН па правах чалавека Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека адзначыў, што Экспертыза апытала 207 пацярпелых і сведкаў і вывучыла больш за 2 500 адзінак інфармацыі і доказаў.[7] Вярхоўны камісар таксама паведаміў, што ў дадатак да 100 задакументаваных выпадкаў злачынстваў на сексуальнай і гендэрнай глебе (ЗСГГ), Экспертыза «вывучыла больш за 180 дадатковых выпадкаў, задакументаваных аўтарытэтнымі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, чый аналіз УВКПЧ палічыла вартым даверу».[8] У разуменні Платформы, многія, калі не ўсе выпадкі, пра якія ідзе гаворка, былі прадстаўлены Платформай у адпаведнасці з запытам Экспертызы, выкладзеным вышэй. Такім чынам, апроч вялікай колькасці пацярпелых і сведкаў, а таксама інфармацыі і доказаў, доступ да якіх быў прадстаўлены Платформай, падтрымка з боку Платформы зрабіла значны ўнёсак у працу Экспертызы і яе высновы пра тое, што парушэнні правоў чалавека, учыненыя ў Беларусі, могуць уяўляць сабой злачынствы супраць чалавечнасці.[9]

Экспертыза УВКПЧ і Платформа таксама каардынавалі свае дзеянні ў іншых сферах, у тым ліку на ўнутраным семінары Платформы, на брыфінгах у Жэневе і Бруселі, а таксама падчас шматлікіх сустрэч і абмеркаванняў з мэтай абмену ведамі і перадачы Платформай інфармацыі і доказаў для Экспертызы.

## Падтрымка органаў крымінальнага правасуддзя

Па стане на 31 сакавіка 2023 г. Платформа атрымала запыты на доступ да інфармацыі і доказаў і на аналітычныя брыфы ад органаў крымінальнага правасуддзя чатырох еўрапейскіх дзяржаў. У справаздачны перыяд Платформа апрацавала запыт ад адной з іх, прадставіўшы гэтаму органу крымінальнага правасуддзя 81-старонкавую аналітычную справаздачу, заснаваную на стэнаграмах інтэрв›ю 23 пацярпелых і сведкаў, афіцыйных дакументах з калекцыі Платформы і сотнях адпаведных файлаў, сабраных з адкрытых крыніц. Цягам наступнага справаздачнага перыяду Платформа завершыць падрыхтоўку матэрыялаў для трох іншых органаў крымінальнага правасуддзя.

## Кіраванне і абмен ведамі

Кіруючы камітэт Платформы і рабочыя каманды працягвалі праводзіць штотыднёвыя сустрэчы для прыняцця палітычных, стратэгічных і аператыўных рашэнняў. Семінары і трэнінгі, праведзеныя пры падтрымцы экспертаў, закранаалі такія тэмы, як распрацоўка прадстаўленняў у адпаведныя органы, дакументаванне парушэнняў правоў чалавека і правядзенне інтэрв›ю, а таксама ЗСГГ. Платформа таксама сустракалася з Кансультатыўным саветам для абмену інфармацыяй аб працы яго чальцоў і садзейнічання каардынацыі і супрацоўніцтву па ключавых тэматычных абласцях.

Таксама Платформа працягвала ўкараняць сістэму перанакіравання на атрыманне навукова абгрунтаванай дапамогі ў сферы псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымкі (ПЗПСП). У справаздачны перыяд паслугі ПЗПСП атрымалі 120 пацярпелых (87 жанчын і 33 мужчын). Платформа таксама забяспечвае доступ да паслуг ПЗПСП, якія прадстаўляюцца спецыялістамі на рускай / беларускай і англійскай мовах, сваім супрацоўнікам, і яны рэгулярна карыстаюцца такімі паслугамі.

## А. Сітуацыя ў краіне

Беларускія ўлады працягваюць пераследаваць праваабаронцаў, журналістаў, адвакатаў, прафсаюзных лідэраў, палітыкаў і актывістаў. Па наяўных дадзеных, на 31 сакавіка 2023 г. колькасць палітычных зняволеных павялічылася да 1 474 чалавек, [10] не лічачы 650 былых палітычных зняволеных, ужо вызваленых у сувязі з адбыццём пакарання, змяненнем меры стрымання або памілаваннем. [11] Вызваленыя працягваюць заяўляць пра тое, што падвяргаліся катаванням і іншым формам жорсткага абыходжання.

Улады працягваюць рэгулярна затрымліваць людзей за ажыццяўленне сваіх грамадзянскіх правоў. Толькі ў сакавіку «Вясне» стала вядома пра 614 затрыманняў, у выніку якіх былі распачатыя 433 палітычна матываваныя адміністрацыйныя справы. Было прызначана не менш за 166 адміністрацыйных арыштаў і 36 штрафаў.[12] Многім прадстаўнікам арганізацый грамадзянскай супольнасці былі прад›яўлены абвінавачанні ў адміністрацыйных правапарушэннях і крымінальных злачынствах,[13] а пры вынясенні абвінаваўчага прысуду яны былі ўключаны ў спісы асоб, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай і/або экстрэмісцкай дзейнасці. [14]

Трэцяга сакавіка 2023 г. чатыры сябры Праваабарончага цэнтру “Вясна” былі асуджаныя да пазбаўлення волі на тэрмін ад 7 да 10 гадоў: Лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру і старшыня Рады “Вясны” Алесь Бяляцкі; Валянцін Стэфановіч, сябра Рады “Вясны” і віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH); Уладзімір Лабковіч, юрыст і каардынатар кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары”; а таксама Зміцер Салаўёў, сябра Рады “Вясны” (асуджаны завочна). [15] З 1 студзеня 2023 года былі асуджаныя яшчэ некалькі вядомых асоб: Святлана Ціханоўская завочна асуджана да 15 гадоў пазбаўлення волі, Павел Латушка завочна -- да 18 гадоў, [16] эксперткі Таццяна Кузіна і Валерыя Касцюгова -- да 10 гадоў, галоўны рэдактар незалежнага партала навін TUT.by Марына Золатава і яго генеральны дырэктар Людміла Чэкіна -- да 12 гадоў кожная. [17]

У сакавіку 2023 г. у Крымінальны кодэкс былі ўнесены заканадаўчыя папраўкі, якія распаўсюджваюць прымяненне смяротнага пакарання на выпадкі дзяржаўнай здрады, здзейсненай дзяржаўным чыноўнікам або ваеннаслужачым,[18] а таксама папраўкі, якія крыміналізуюць прапаганду тэрарызму і дыскрэдытацыю ўзброеных сіл, і ўводзяць штраф у памеры да 50 000 базавых велічынь (658 000 еўра) за «шэраг злачынстваў антыдзяржаўнага характару».[19]

Улады працягвалі перашкаджаць арганізацыям грамадзянскай супольнасці, адвакатам, журналістам і іншым асобам паведамляць пра парушэнні правоў чалавека ці весці незалежную дзейнасць. Па дадзеных Lawtrend, не менш за 823 некамерцыйных арганізацыі знаходзяцца ў працэсе прымусовай ліквідацыі, а яшчэ 456 арганізацый вымушаны самаліквідавацца.[20] Арганізацыі грамадзянскай супольнасці, што былі ліквідаваны або зазналі ціск з боку ўладаў, спынілі сваю дзейнасць, альбо працягваюць яе па-за межамі Беларусі. 28 лютага 2023 г. КДБ уключыў Беларускую асацыяцыю журналістаў у спіс «экстрэмісцкіх фармаванняў»,[21] указаўшы, што «група грамадзян з ліку прадстаўнікоў няўрадавай грамадскай арганізацыі «Беларуская асацыяцыя журналістаў» ажыццяўляе экстрэмісцкую дзейнасць». З лета 2020 года больш за 90 адвакатаў былі пазбаўленыя права займацца адвакацкай дзейнасцю, а 7 адвакатаў былі зняволеныя па палітычных матывах.[22]

Працягваецца сітуацыя беспакаранасці за парушэнні правоў чалавека, учыненыя ў Беларусі, у сувязі з выхадам Беларусі 8 лістапада 2022 г. з Факультатыўнага

пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які ўступіў у сілу з 8 лютага 2023 г., што пазбаўляе беларускіх грамадзян магчымасці паведамляць аб парушэннях Пакта ў Камітэт ААН па правах чалавека.

## B. Выкананне асноўных мэтаў Платформы

Платформа працягвала выконваць свае задачы па зборы, кансалідацыі, захаванні і аналізе інфармацыі і доказаў злачынстваў па міжнародным праве, меркавана здзейсненых у кантэксце прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года і пасля іх, і аказваць падтрымку органам па прыцягненню да адказнасці шляхам прадстаўлення ім інфармацыі, доказаў і адпаведных аналітычных прадуктаў, забяспечваючы пры гэтым падыход, арыентаваны на пацярпелых, які ўлічвае іх траўмы.

### a. Збор інфармацыі і доказаў

Мэтай Платформы з›яўляецца кансалідацыя і захаванне інфармацыі і доказаў для падтрымкі фактычных і юрыдычных расследванняў і аналізу па трох напрамках, якія маюць дачыненне да меркаванага здзяйснення злачынстваў у Беларусі:

a. **Факты злачынстваў**, а менавіта дзеянні, што ляжаць у аснове злачынстваў супраць чалавечнасці, такія як катаванні, сэксуальны і гендэрны гвалт, дэпартацыя, пазбаўленае волі, забойствы/пазасудовыя забойствы і пераслед;
b. **Кантэкстуальныя элементы злачынстваў супраць чалавечнасці**, а менавіта наяўнасць шырокамаштабнага ці сістэматычнага нападу, накіраванага супраць грамадзянскага насельніцтва, у адпаведнасці з палітыкай беларускай дзяржавы ці ў яе развіццё; і
c. **Датычнасць** выканаўцаў да асноўных злачынных дзеянняў, у тым ліку фізічных выканаўцаў, а таксама тых, хто нясе іншую адказнасць у сілу свайго становішча ў камандных структурах.

Платформа працягнула збор інфармацыі і сведчанняў ад пацярпелых і сведкаў, а таксама з адкрытых крыніц, якія могуць прадставіць доказы злачынстваў па міжнародным праве, здзейсненых беларускімі дзяржаўнымі органамі.

#### i. Збор інфармацыі ў пацярпелых і іншых сведак

З 1 красавіка 2021 г. «Вясна» і Міжнародны камітэт сабралі інфармацыю і сведчанні ў 1030 пацярпелых і іншых сведак (684 мужчын і 346 жанчын) аб меркаваных злачынствах па міжнародным праве, у тым ліку адпаведныя дакументальныя сведчанні, такія як медыцынскія і судовыя дакументы. Яны па-ранейшаму структуруюцца для захавання і аналізу (падрабязней пра гэта гаворыцца ў частцы B.c.i ніжэй), пры гэтым асобныя інтэрв›ю са сведкамі і дакументальныя матэрыялы перакладаюцца з беларускай/рускай моваў на ангельскую і захоўваюцца разам з матэрыяламі на мове арыгінала.

#### ii. Збор інфармацыі з адкрытых крыніц

Паралельна са зборам і захаваннем матэрыялаў, звязаных з пацярпелымі/сведкамі, Платформа працягвала збіраць дадзеныя з адкрытых крыніц. З красавіка 2021 года Платформа сабрала больш за 772 768 матэрыялаў з адкрытых крыніц,

у тым ліку 102 740 відэа, 318 589 выяваў і 351 439 тэкставых матэрыялаў з 418 крыніц, якія захоўваюцца і аналізуюцца (пра гэта гаворыцца ў частцы B.b.ii ніжэй).

### b. Кансалідацыя,захаванне, праверка і аналіз інфармацыі і доказаў

Для захавання сабранай інфармацыі і сведчанняў, праверкі іх сапраўднасці (пры неабходнасці) і іх аналізу Платформа выкарыстоўвае два спецыяльна распрацаваных лічбавых архівы. У справаздачны перыяд Платформа працягвала структураваць, загружаць і аналізаваць вялікую колькасць матэрыялаў для дасягнення сваіх мэт па маркіраванні ўсіх матэрыялаў у калекцыі да канца Фазы II (верасень 2023 г.) і завяршэнні падрыхтоўкі адказаў на запыты органаў крымінальнага правасуддзя чатырох дзяржаў, а таксама на дадатковыя запыты ад Экспертызы УВКПЧ і іншых органаў па меры іх узнікнення.

#### i. Матэрыял пацярпелых/сведак з закрытых крыніц

Структура для загрузкі матэрыялаў была распрацавана сакратарыятам Платформы ў лістападзе-снежні 2021 г. Са студзеня 2022 г. пачаўся працэс рэструктурызацыі і загрузкі сабраных Платформай інфармацыі і сведчанняў. Па стане на 31 сакавіка 2023 г. было рэструктуравана і загружана ў лічбавы архіў Платформы каля 20 000 дакументаў, якія тычацца 2270 пацярпелых і сведак, у тым ліку стэнаграмы інтэрв›ю, медыцынскія заключэнні і судовыя матэрыялы, а таксама адпаведныя пераклады на ангельскую мову.

Згодна са стратэгіяй Платформы па рэцэнзаванні матэрыялу, пасля загрузкі дакументы праглядаюцца і маркіруюцца ў адпаведнасці з устаноўленымі фактамі (такімі як, у прыватнасці, месца, час/дата, інцыдэнт, кантэкст і патэнцыйна адказныя дзяржаўныя суб›екты), згодна з кантэксна-спецыфічнымі схемамі кадавання, распрацаваным Платформай, а затым аналізуюцца для падрыхтоўкі аналітычных брыфаў.

Да красавіка 2023 г. каманда прафесійных двухмоўных (руская-ангельская) рэцэнзентаў прагледзела і прамаркіравала 60% ад агульнай колькасці дакументаў, частка з якіх затым была ўключана ў аналітычны брыф, прадстаўлены органам крымінальнага правасуддзя адной дзяржавы (гл. частку B.c.iii).

#### ii. Матэрыялы з адкрытых крыніц

Захаванне арыгінальнай інфармацыі з адкрытых крыніц забяспечвае яе даступнасць для органаў па забеспячэнні адказнасці і іншых суб›ектаў у будучыні, нягледзячы на накладзеныя беларускімі ўладамі абмежаванні на доступ да незалежных СМІ (напрыклад, шляхам адабрання медыя ліцэнзій), блакіроўку сайтаў, дзе была размешчана гэта інфармацыя, або выдаленне інфармацыі асобамі, што яе размясцілі. Напрыклад, інфармацыя з Telegram-канала GUBOPiK, выдаленага Telegram за «публікацыю асабістых дадзеных беларусаў, нязгодных з рэжымам»[23], была б назаўжды страчана, калі б не была архівавана Платформай.

Для рэцэнзавання матэрыялу з адкрытых крыніц і яго маркіроўкі Платформа выкарыстоўвае розныя пошукавыя тэрміны і метады для выяўлення актуальных матэрыялаў, якія далей арганізуюцца ў тэматычныя групы, такія як дзяржаўная палітыка, ланцуг камандавання, базавыя злачынствы, што адпавядае мэтам расследавання і аналіза. Па стане на 31 сакавіка 2023 г. Платформа разгледзела і маркіравала 3104 файлы з адкрытых крыніц, якія належаць да гэтых тэматычных груп.

### iii. Злачынствы на сексуальнай и гендэрнай глебе

У справаздачны перыяд Платформа пачала даследаванні, накіраваныя на ўмацаванне свайго патэнцыялу па аналізе інфармацыі і доказаў, якія датычацца злачынстваў на сэксуальнай і гендэрнай глебе (ЗСГГ), і аказанню падтрымкі органам крымінальнага правасуддзя і іншым органам забеспячэння адказнасці ў іх расследаваннях. Платформа працавала з экспертам па ЗСГГ, які правёў агляд матэрыялаў і структур кадавання, а таксма кансультавалася з экспертамі па гендэрных пытаннях у Беларусі і правяла семінар з удзелам Платформы і іншых экспертаў (у тым ліку з Міжнароднага непрадузятага і незалежнага механізму па Сірыі (IIIM), Вашынгтонскага. універсітэта ў Сэнт-Луісе і Экспертызы УВКПЧ) (гл. часткі B.c.i і C.a) У выніку гэтай працы Платформа ўкараніла інструменты для дапамогі ў выяўленні ЗСГГ і ўнесла змены ў свае структуры кадавання, каб спецыялісты па рэцэнзаванні і аналізе дадзеных маглі распазнаваць такія злачынствы ў працэсе кадавання і аналітычнай працы. У працяг гэтага даследавання ў бліжэйшыя месяцы Платформа будзе працаваць над стварэннем «дапаможніка» па ЗСГГ ў Беларусі, прызначанага для органаў крымінальнага правасуддзя, каб дапамагчы ім зразумець рэлевантнасць і ўплыў гендэрных норм на здзяйсненне ЗСГГ у Беларусі, а таксама перашкоды для збору інфармацыі і доказаў ЗСГГ у кантэксце Беларусі і спосабы іх пераадолення. Акрамя таго, Платформа правядзе трэнінг для павышэння магчымасцей па выяўленні і зборы інфармацыі аб ЗСГГ у пацярпелых і сведкаў і яе аналізе.

## c. Дапамога органам па забеспячэнні адказнасці

Платформа працягвала ўзаемадзейнічаць і падтрымліваць органы па прыцягненню да адказнасці, у тым ліку Экспертызу УВКПЧ, Спецыяльнага дакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і шматлікія нацыянальныя органы крымінальнага правасуддзя.

### i. Экспертыза УВКПЧ па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі

Платформа імкнецца аказваць падтрымку Экспертызе УВКПЧ у выкананні яе мандата па маніторынгу і асвятленні сітуацыі ў галіне правоў чалавека і ўсебаковым разглядзе ўсіх парушэнняў правоў чалавека, меркавана здзейсненых у Беларусі. Да заканчэння 31 сакавіка 2023 г. мандата ад Савета па правах чалавека, Платформа і Экспертыза правялі мноства сустрэч і абмеркаванняў з мэтай абмену ведамі і прадастаўлення інфармацыі і доказаў для Экспертызы.

У адпаведнасці з названымі дамоўленасцямі, у жніўні 2022 г. Экспертыза накіравала Платформе запыты аб доступе да пацярпелых і сведак, а ў кастрычніку 2022 г. -- аб прадстаўленні інфармацыі і доказаў па прыярытэтных напрамках. На запыт Экспертызы аб доступе да пацярпелых і сведкаў беларускія сукіраўнікі Платформы падалі Экспертызе спісы са 159 апытаных, якія далі згоду на размову з прадстаўнікамі Экспертызы. З гэтага спісу Экспертыза вызначыла асоб, з якімі хацела б паразмаўляць, а арганізацыі-сукіраўнікі Платформы дапамаглі з арганізацыяй лагістыкі гэтых сустрэч. Па запыце Экспертызы аб доступе да інфармацыі і доказаў, Платформа прааналізавала сабраныя дадзеныя з тым, каб выявіць матэрыялы, якія датычацца прыярытэтных абласцей дзейнасці Экспертызы. На падставе гэтага аналізу Платформа прадставіла падрабязны спіс з больш за 1300 матэрыялаў з адкрытых і закрытых крыніц з аглядам метадалогіі, выкарыстанай для іх выяўлення, і стварыла адмысловую прастору ў сваіх лічбавых

архівах, каб даць следчым Экспертызы доступ да матэрыялаў з закрытых крыніц.

Акрамя таго, Экспертыза звярнулася да Платформы з просьбай узяць удзел у кансультацыі экспертаў, разам з яе экспертамі і Спецыяльным дакладчыкам па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, каб абмеркаваць, як забяспечыць доступ пацярпелых да сродкаў прававой абароны і кампенсацыі шкоды. Сярод іншага, Платформа заклікала Экспертызу даць рэкамендацыі дзяржавам па перадачы сітуацыі ў Беларусі ў Міжнародны крымінальны суд, па выкарыстанні механізма ўніверсальнай юрысдыкцыі і трансгранічнага супрацоўніцтва, а таксама па ўплыве санкцый (у прыватнасці, забароны на паездкі) на магчымасць дзяржаў атрымаць доступ да асоб, якія здзейснілі злачынствы.

У справаздачы Экспертызы, прадстаўленай Савету ААН па правах чалавека, Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека паведаміў, што было апытана 207 пацярпелых і сведак і вывучана больш за 2500 адзінак інфармацыі і доказаў.[24] Вярхоўны камісар таксама давёў, што ў дадатак да 100 задакументаваных Экспертызай выпадкаў ЗСГГ, было «разгледжана больш за 180 іншых выпадкаў, задакументаваных аўтарытэтнымі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, чый аналіз УВКПЧ палічыла вартым даверу».[25] У разуменні Платформы, многія, калі не ўсе выпадкі, пра якія ідзе гаворка, былі прадстаўлены ў адпаведнасці з выкладзеным вышэй запытам Экспертызы. Адпаведна, акрамя вялікай колькасці пацярпелых і сведак, а таксама больш за 1300 адзінак інфармацыі і доказаў, доступ да якіх быў прадастаўлены Платформай, падтрымка з боку Платформы зрабіла значны ўнёсак у працу Экспертызы і яе высновы пра тое, што парушэнні правоў чалавека, здзейсненыя ў Беларусі, могуць уяўляць сабой злачынствы супраць чалавечнасці.[26]

Каардынацыя дзейнняў паміж Экспертызай і Платформай адбывалася і ў іншых абласцях, у тым ліку, на ўнутраных семінарах Платформы (гл. часткі B.b.iii і C.a) і брыфінгах для дзяржаў і іншых зацікаўленых бакоў, праведзеных Платформай у Жэневе і Брусэлі пасля дыялогу Вярхоўнага камісара ААН аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі ў Радзе ААН па правах чалавека (гл. частку E.b). Разам з сябрам Кансультатыўнага савета, прадстаўнікі Платформы таксама сустрэліся з экспертамі і членамі каманды Экспертызы ў дзень дыялогу Вярхоўнага камісара, каб абмеркаваць працу і будучае супрацоўніцтва ў выпадку падаўжэння мандата Экспертызы.

### ii. Спецыяльны дакладчык па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі

За справаздачны перыяд, акрамя сумеснага ўдзелу ў вышэйзгаданай кансультацыі Экспертызы і каардынацыйным мерапрыемстве грамадзянскай супольнасці (частка C.a), Платформа сустрэлася са Спецыяльным дакладчыкам па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, каб абмеркаваць бягучую працу і абмяняцца ведамі па шэрагу пытанняў.

### iii. Органы крымінальнага правасуддзя

Па стане на 31 сакавіка 2023 г. Платформа атрымала запыты на доступ да інфармацыі і доказаў і аналітычныя брыфы ад органаў крымінальнага правасуддзя чатырох еўрапейскіх дзяржаў. Сюды ўваходзяць запыты на доступ да пацярпелых/сведак, якія могуць прадставіць інфармацыю аб выяўленых інцыдэнтах, а таксама на інфармацыю і доказы, якія датычацца кантэкстуальных элементаў злачынстваў супраць чалавечнасці і дзяржаўных сілавых структур.

У перыяд з 22 лістапада 2022 г. па 27 лютага 2023 г. Платформа апрацавала запыт нацыянальнага органа крымінальнага правасуддзя адной з еўрапейскіх

дзяржаў, у якім запрошвалася інфармацыя пра злачынствы, здзейсненыя ў Беларусі ў кантэксце прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня і наступных падзей. Пасля выяўлення і аналізу інфармацыі і доказаў, а таксама збору звестак з адкрытых крыніц, Платформа прадставіла органу крымінальнага правасуддзя 81-старонкавую аналітычную справаздачу, заснаваную на стэнаграмах інтэрв›ю 23 пацярпелых і сведак (пры наяўнасці інфармаванай згоды), іншых дакументах, прадстаўленых апытанымі, афіцыйных дакументах, і сотнях адпаведных матэрыялаў з адкрытых крыніц з каналаў Telegram, каналаў YouTube і вэбсайтаў (напрыклад, Telegra.ph). Паколькі Платформа не мела поўнай інфармацыі аб аб›ёмах расследавання, пошук матэрыялаў насіў агульны характар. Такая інфармацыя была прадстаўлена ў якасці следчай версіі, таму Платформа не выказвала ніякага меркавання аб яе правамоцнасці ці дакладнасці.

У найбліжэйшыя месяцы Платформа завершыць працу над матэрыяламі для трох іншых органаў крымінальнага правасуддзя, як толькі будзе праведзены аналіз большасці матэрыялаў з закрытых крыніц і зроблена падборка матэрыялаў з адкрытых крыніц. У апошнія месяцы была завершана праца па падрыхтоўцы юрыдычнага агляду ў прадстаўленых матэрыялах, які мае дачыненне да аналізу інфармацыі і доказаў, а таксама па ўключэнні публічных справаздач аб сітуацыі.

У дадатак да бягучага маркіравання, аналізу і падрыхтоўкі матэрыялаў да прадстаўлення ў адпаведныя органы, Платформа выкарыстоўвае матэрыялы з закрытых і адкрытых крыніц для складання храналогіі і карты падзей з 9 па 12 жніўня, якая будзе прадастаўлена органам крымінальнага правасуддзя разам з інфармацыяй і доказамі і адпаведнымі аналітычнымі прадуктамі і паслужыць асновай для стварэння на сайце Платформы візуалізацый, калі мандат Платформы будзе працягнуты.

## C. Абмен ведамі і нарошчванне патэнцыялу

### a. Сакратарыят, каманды арганізацыі-кіраўніка і сукіраўнікоў

Структура Платформы забяспечвае цеснае супрацоўніцтва паміж камандамі арганізацыі-кіраўніка, сукіраўнікоў і сакратарыята. На працягу ўсяго справаздачнага перыяду Кіраўнічы камітэт працягваў праводзіць штотыднёвыя і спецыяльныя паседжанні для прыняцця рашэнняў адносна палітыкі і стратэгічнага накірунку працы Платформы, а таксама сумесна ўдзельнічаў у мерапрыемствах і сустрэчах са стэйкхолдэрамі, як адкрытых, так і канфідэнцыйных. Сакратарыят Платформы працягваў працаваць у цесным супрацоўніцтве з камандамі дакументатараў арганізацый-сукіраўнікоў, у тым ліку ў форме штодвухтыднёвых нарад па аператыўных пытаннях і рэгулярных вочных семінараў, а таксама іх інтэграцыі ў разнастайную аналітычную працу. Гэтая ўнікальная структура дазваляе абменьвацца ведамі па актуальных для працы пытаннях, такіх як міжнароднае крымінальнае права і стандарты і беларускі кантэкст, а таксама выяўляць патрэбы ці прабелы ў кампетэнцыях.

У рамках гэтага ўзаемадзеяння Платформа праводзіць спецыяльныя семінары і трэнінгі па актуальных тэмах, якія праходзяць пры падтрымцы экспертаў-кансультантаў Платформы (пра іх у частцы F.c ніжэй). У справаздачны перыяд былі праведзены наступныя семінары:

- Семінар па супрацоўніцтве ў распрацоўцы матэрыялаў у адказ на запыты органаў крымінальнага правасуддзя і ўзаемадзеянні з імі (лістапад 2022 г.);
- Кансультацыя па падыходах, арыентаваных на пацярпелых, у рабоце Платформы (снежань 2022 г.);
- Кансультацыя з арганізацыяй «Partners in Justice International» для абмеркавання пытанняў, якія ўзніклі падчас семінара па дакументаванні парушэнняў правоў чалавека, які адбыўся ў верасні 2022 г. (снежань 2022 г.);
- Семінар па захаванні інфармацыі і доказаў, арганізаваны беларускім сябрам Кансультатыўнага савета (студзень 2023 г.);
- Семінар па зборы інфармацыі і доказаў адносна ЗСГГ з удзелам экспертаў з Міжнароднага бесстаронняга і незалежнага механізму па расследаванні злачынстваў у Сірыі, Вашынгтонскага ўніверсітэта ў Сэнт-Луісе і Экспертызы УВКПЧ (студзень 2023 г.); а таксама
- Трэнінг арганізацыі Partners in Justice International па правядзенні следчых інтэрв›ю (люты 2023 г.).

### b. Кансультатыўны савет

Платформа рэалізавала сваю стратэгію па ўмацаванні ўзаемадзеяння з Кансультатыўным саветам па пытаннях каардынацыі працы, звязанай з прыцягненнем да адказнасці. Акрамя бягучых двухбаковых сустрэч паміж Платформай і членамі Кансультатыўнага савета, прайшлі паседжанні Кансультатыўнага савета па абмеркаванні тэматычных пытанняў у лістападзе 2022 г. і лютым 2023 г. Акрамя таго, сябры Кансультатыўнага савета прымаюць удзел у мерапрыемствах, такіх як сустрэчы з Экспертызай УВКПЧ і іншых мерапрыемствах, указаных у частках C.a і E.b.

### c. Іншыя беларускія і міжнародныя арганізацыі

Па меры магчымасці Платформа ўдзельнічае ў мерапрыемствах з іншымі НДА і міжнароднымі арганізацыямі з мэтай абмену інфармацыяй аб сваёй працы і садзейнічанні супрацоўніцтву там, дзе гэта мэтазгодна. У справаздачным перыядзе Платформа брала ўдзел у: семінары па захаванні дадзеных, арганізаваным беларускім сябрам Кансультатыўнага савета; каардынацыйнай сустрэчы грамадзянскай супольнасці, на якой прысутнічалі беларускія і міжнародныя НДА; і семінары, арганізаваным экспертнай арганізацыяй Mnemonic.

## D. Падтрымка доступу да паслугаў псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымкі

У рамках свайго арыентаванага на пацярпелых з улікам іх траўмаў падыходу да прыцягнення да адказнасці за злачынствы па міжнародным праве, здзейсненыя ў Беларусі, Платформа імкнецца забяспечыць пацярпелым навукова абгрунтаваную дапамогу ў галіне псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымкі (ПЗПСП). З 1 кастрычніка 2022 г. паслугі ПЗПСП атрымалі 120 пацярпелых (87 жанчын і 33 мужчыны).

У супрацоўніцтве з членам Кансультатыўнага савета «Лекары за правы чалавека» (Physicians for Human Rights, PHR) Платформа рыхтуе трэнінг па прадухіленні суіцыдаў і мерах у адказ для каманд, якія ўзаемадзейнічаюць і праводзяць інтэрв›ю з пацярпелымі і сведкамі.

Платформа таксама забяспечвае доступ да паслуг ПЗПСП, якія прапануюцца спецыялістамі на беларускай/рускай і ангельскай мовах, сваім супрацоўнікам, і яны рэгулярна карыстаюцца такімі паслугамі.

## E. Сувязі з грамадскасцю і адвакатаванне

Платформа прытрымліваецца асцярожнай палітыкі ў дачыненні да камунікацый і адвакацыі, каб захаваць незалежнасць і бесстароннасць, а таксама знешняе ўспрыманне свой следчай і кансультатыўнай працы як незалежнай і бесстаронняй. Тым не менш, Платформа рэгулярна ўдзельнічала на палітычным узроўні ў двухбаковых абмеркаваннях з палітыкамі і іншымі ключавымі гульцамі, а часам і выступала на грамадскіх форумах. У лік такіх мерапрыемстваў і сустрэч увайшлі:

- Удзел у брыфінгу Еўраюста па Дапаможніку Міжнароднага крымінальнага суда па дакументаванні міжнародных злачынстваў і парушэнняў правоў чалавека ў мэтах прыцягнення да адказнасці (6 кастрычніка 2022 г.);
- Выступ на паралельным мерапрыемстве высокага ўзроўню 29-га паседжання Савета міністраў АБСЕ ў Лодзі па тэме *«Пагаршэнне палітычнай сітуацыі і сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і яе наступствы для рэгіёна АБСЕ»*, арганізаваным Эстоніяй (1 снежня 2022 г.);
- Прэзентацыя на паралельным мерапрыемстве ў Савеце па правах чалавека ААН *«Прыцягненне да адказнасці за міжнародныя злачынствы і сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека ў Беларусі»*, арганізаваным некалькімі дзяржавамі і НДА (2 сакавіка 2023 г.);
- Брыфінг прадстаўнікоў дзяржаў у Жэневе па дакладзе Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека Савету ААН па правах чалавека аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (23 сакавіка 2023 г.), арганізаваны Платформай і Прадстаўніцтвам Нідэрландаў у Жэневе, у якім брала ўдзел Экспертыза УВКПЧ; і
- Брыфінг прадстаўнікоў дзяржаў у Брусэлі па дакладзе Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека Савету ААН па правах чалавека аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і аб рабоце Платформы ў бягучы момант (28 сакавіка 2023 г.), арганізаваны Платформай і Амбасадай Даніі ў Брусэлі, у якім бралі ўдзел член Кансультатыўнага савета Платформы Сусветная арганізацыя супраць катаванняў (ОМСТ) і Экспертыза УВКПЧ.

Платформа прытрымліваецца асцярожнай палітыкі публічных камунікацый, аднак працягвае публікаваць інфармацыю аб сваёй працы ў сваім твітары (@IAPBelaurus) і на сайце (www.iapbelarus.org).

## F. Інфраструктура Платформы

### a. Фінансаванне

У час Фазы I Платформу падтрымлівала шырокае кола дзяржаў, у прыватнасці Аўстрыя, Бельгія, Вялікабрытанія, Германія, Данія, Злучаныя Штаты, Ірландыя, Ісландыя, Канада, Латвія, Літва, Ліхтэнштэйн, Нарвегія, Нідэрланды, Польшча, Румынія, Славакія, Фінляндыя, Чэхія , Швейцарыя, Эстонія, а таксама Еўрапейскі Саюз.

У час Фазы II, у бягучы перыяд, Платформу падтрымліваюць Аўстрыя, Вялікабрытанія, Германія, Данія, ЗША, Ісландыя, Ірландыя, Латвія, Нарвегія, Нідэрланды, Славакія, Швейцарыя, Швецыя, Фінляндыя, Эстонія, а таксама Еўрапейскі Саюз. Чатыры іншыя дзяржавы паведамілі, што дадуць ці магчыма дадуць фінансаванне ў 2023 г.

На працягу ўсяго справаздачнага перыяду Платформа атрымлівала фінансаванне ад дзяржаў-донараў на рэгулярнай аснове. Толькі восем дзяржаў перадалі фінансаванне праз Еўрапейскі фонд у падтрымку дэмакратыі (EED), пры тым, што для шэрагу астатніх донараў DIGNITY павінна была падаваць фінансавую справаздачнасць паводле патрабаванняў кожнага асобнага донара. Адпаведна, кіраўнік і праграмны менеджэр Платформы, а таксама фінансавая і кіраўнічая каманда DIGNITY прысвяцілі значную колькасць часу падрыхтоўцы заявак на фінансаванне і складанню фінансавых і апісальных справаздач для донараў. У дадатак да паўгадавых справаздач аб праведзенай працы і фінансавай справаздачнасці, якія Платформа абавязалася складаць з моманту свайго стварэння, сюды ўвайшлі штоквартальныя фінансавыя справаздачы і справаздачы аб праведзенай працы і абцяжарвальны фінансавы аўдыт у канцы кожнай фазы на аснове агульнага бюджэту, а таксама справаздачнасць па спецыяльных бюджэтах, якія Платформа павінна была распрацаваць для канкрэтных донараў. Гэтыя працэсы перагрузілі арганізацыйную структуру і ўяўляюць сабой значную крыніцу выдаткаў, калі іх не будзе магчымасці іх урэгуляваць.

### b. Персанал

У дадатак да існуючай каманды сакратарыята Платформы, якая складаецца з кіраўніка, мэнэджэра праекта, старэйшага юрысконсульта, аналітыка, следчага па адкрытых крыніцах, мэнэджэра сістэм дадзеных і сямі рэцэнзентаў дадзеных, у справаздачны перыяд Платформа наняла чатырох малодшых аналітыкаў, двух экспертаў-кансультантаў і праектнага спецыяліста.

### c. Кансультацыі з экспертамі

Платформа па-ранейшаму працягвала атрымліваць кансультатыўную падтрымку ад PJI, Mnemonic і FORCYD.

## Зноскі

1. Вясна, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі, сакавік 2023: https://spring96.org/en/news/111306.
2. Там жа.
3. Там жа.
4. Reuters, *Лідэр беларускай апазіцыі асуджана на 15 гадоў за «дзяржаўную здраду»,* 6 сакавіка 2023 г.:https://www.reuters.cohttps://www.reuters.com/world/europe/belarus-court-sentences-exiled-opposition-leader-15-years-prison-2023-03-06/m/world/europe/belarus-court-sentences-exiled-opposition-leader-15-years-prison-2023-03-06/.
5. Lawtrend, *Маніторынг НКА ў Беларусі, якія знаходзяцца ў працэсе прымусовай ліквідацыі ці прынялі рашэнне аб самаліквідацыі* (2021-2023), https://www.lawtrend.org/liquidation-nko.
6. Гл. https://www.defenders.by/.
7. Гл. Стан ў галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, *Даклад Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб›яднаных Нацый па правах чалавека*, UN Doc. A/HRC/52/68 (3 February 2023), paras. 4-5: https://www.ohchr.org/en/documents/country-reports/ahrc5268-belarus-run-2020-presidential-election-and-its-aftermath-report.
8. Там жа, para. 39.
9. Там жа, para. 54.
10. Вясна, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі, сакавік 2023 г.: https://spring96.org/en/news/111306.
11. Там жа.
12. Там жа.
13. Lawtrend, *Маніторынг сітуацыі са свабодай аб›яднання і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь,* сакавік 2023 г.: https://www.lawtrend.org/english/monitoring-the-situation-of-freedom-of-association-and-civil-society-organisations-in-the-republic-of-belarus-march-2023.
14. Міністэрства ўнутраных спраў, *Аб мерах супрацьдзеяння экстрэмізму і рэабілітацыі нацызму*, 14 кастрычніка 2021 г., https://www.mvd.gov.by/ru/news/8642
15. Вясна, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі, сакавік 2023 г.: https://spring96.org/en/news/111306.
16. Reuters, *Лідэр беларускай апазіцыі асуджана на 15 гадоў за «дзяржаўную здраду»,* 6 сакавіка 2023 г.: https://www.reuters.cohttps://www.reuters.com/world/europe/belarus-court-sentences-exiled-opposition-leader-15-years-prison-2023-03-06/m/world/europe/belarus-court-sentences-exiled-opposition-leader-15-years-prison-2023-03-06/.
17. Committee to Protect Journalists, *Беларуская журналістка Марына Золатава асуджана да 12 гадоў пазбаўлення волі, Валерыя Касцюгова -- да 10 гадоў,* 17 сакавіка 2023 г.: https://cpj.org/2023/03/belarusian-journalist-maryna-zolatava-sentenced-to-12-years-in-prison-valeryia-kastsiuhova-to-10-years/; Вясна, *Палітычныя эксперты атрымалі па 10 гадоў турмы*, 17 сакавіка 2023 г.: https://spring96.org/en/news/111099.
18. Крымінальны кодекс, арт. 356.
19. *Апублікаваны закон аб зменах у КК, які ўводзіць адказнасць за дыскрэдытацыю арміі і пакаранне для чыноўнікаў за дзяржзраду*, 14 сакавіка 2023 г.: https://zerrkalo.fun/news/economics/34556.html?tg.
20. Lawtrend, *Маніторынг НКА ў Беларусі, якія знаходзяцца ў працэсе прымусовай ліквідацыі ці прынялі рашэнне аб самаліквідацыі* (2021-2023): https://www.lawtrend.org/liquidation-nko.
21. БАЖ, *Беларускую асацыяцыю журналістаў прызналі «экстрэмісцкім фармаваннем»*, 15 сакавіка 2023 г.: https://baj.by/en/content/belarusian-association-journalists-designated-extremist-formation.
22. Гл. https://www.defenders.by/.
23. Гл. Belsat, *Тэлеграм выдаліў канал ГУБОПіК*, 12 сакавіка 2022 г.: https://belsat.eu/en/news/12-03-2022-telegram-deletes-gubopik-channel.
24. Гл. Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, *Даклад Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека*, UN Doc. A/HRC/52/68 (3 лютага 2023 г.), paras. 4-5: https://www.ohchr.org/en/documents/country-reports/ahrc5268-belarus-run-2020-presidential-election-and-its-aftermath-report.
25. Там жа, para. 39.
26. Там жа, para. 54.